# НОВАЯ СВІНАФЕРМА

Напярэдадні свята сельскіх працаўнікоў у калгасе «Чырвоны маяк» уступіла ў строй новая свінаферма. У двух вялікіх памяшканнях размешчаны асноўныя і разавыя свінаматкі, кныры, парасяты на дарошчванні і адкорме. Агульнае пагалоўе даходзіць да паўтары тысячы. Сапраўдная фабрыка мяса.

Трэба аддаць належнае старшыні праўлення калгаса А. І. Грыбянькову, што ў такі цяжкі час, калі не хапае будаўнічых матэрыялаў і дужа вялікія на іх цэны, здолеў пабудаваць такі аб'ект, заасфальтаваць двор і дарогу да яго, вясковыя вуліцы. 4,5 кіламетра асфальтаваных дарог дабавілася сёлета ў гаспадарцы. Каля чатырох мільёнаў рублёў пайшло на будаўніцтва свінафермы.

Напярэдадні прафесійнага свята работнікаў сельскай гаспадаркі і перапрацоўваючай прамысловасці на новай свінаферме адбыўся сход жывёлаводаў. Старшыня калгаса А. І. Грыбянькоў па-душах пагутарыў з імі, тут жа на месцы былі вырашаны надзённыя пытанні. А ў заключэнне ён сардэчна павіншаваў жывёлаводаў з надыходзячым святам, пажадаў усім шчасця і здароўя.

С. ЛЬВОЎ.

**Львоў, С. Новая свінаферма** / С. Львоў // Шлях Кастрычніка. — 1992. — 21 лістапада. — С. 3.